Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!



# ГРОДЗЕНСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, ПРАФКОМАЎ, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА
ГРОДЗЕНСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ ЯНКІ КУПАЛЫ

№ 16 (140) Аўторак, 22 мая, 1990 года

## *707801 — рахунак міласэрнасці*

**Зараз паўсюль чуваць, што з Чарнобылем пачалася новая эра ў гісторыі чалавецтва.**

**Яна пачалася Тут.**

**Тутэйшыя, жыхары зямлі беларускай, увесь свет адзначыў яшчэ адну чорную гадавіну. Зверы і дрэвы недаўменна пазіраюць, як чалавек пакідае спрадвеку абжытыя мясціны. Яны і самі выраджаюцца: слабеюць, ціха знікаючы ў вечнасці.**

**Мы яшчэ не асэнсавалі пасапраўднаму вынікаў страшнае аварыі і пытаем сябе: а ці ўсе пакараны злачынцы? Ці ўсё рабілася ды робіцца для выратавання жывых людзей? І адказваем: не!**

**Дык яднаймася перад тварам агульнае бяды, якая не толькі не выбірае, якая не абмінае нікога! Чалавек, разумная істота, прынёс у прыроду абсурд, але менавіта яго смерць — гэта смерць вечнасці.**

**707801 — рахунак «Дзеці Чарнобыля». Вось магчымасць праявіць сапраўдную чалавечую міласэрнасць, дабрыню, пералічыўшы сродкі. Дзеля здароўя нашай дзетвары, дзеля жыцця і будучыні.**

**Нам пішуць**

## Будзем грамадзянамі

Францішак Багушэвіч. Якому сапраўднаму беларусу не знаёма імя гэтага беларускага паэта-дэмакрата?! Але ў наш час навукова-тэхнічнай рэвалюцыі і прагрэсу мы ўспамінаем чалавека чамусьці толькі ў сувязі з дзвюма «вялікімі» датамі — днямі нараджэння і смерці. У гэтым годзе споўнілася 150 год са дня нараджэння Ф. Багушэвіча. Гэтай вялікай даце і быў прысвечаны вечар, які праходзіў ва універсітэце.

Цікавым ён атрымаўся. Студэнткі філфака чыталі вершы паэта і яго прадмовы да зборнікаў «Дудка беларуская» і «Смык беларускі». Выступілі выкладчыкі кафедры беларускай літаратуры, госці з Менску. Свае вершы чыталі студэнты з літаб 'яднання «Наднёманскія галасы». На жаль, не высокую актыўнасць праявілі студэнты, нямногія з іх палічылі патрэбным для сябе прысутнічаць на гэтым цікавым вечары. Але ж як можна жыць без літаратуры, асабліва сваёй, нацыянальнай? Вядомы англійскі пісьменнік О. Чайльд пісаў, што ў кожнага чалавека ёсць продкі не толькі ў родзе: яны ёсць і ў літаратуры. Дык давайце чытаць кнігі, паважаць памяць пісьменнікаў і паэтаў. Давайце любіць нашу беларускую мову і літаратуру. Любіце беларускую культуру. З культуры сваёй нацыі мы пачынаемся як грамадзяне.

**А. ФРЭЙД,**
**3 курс філфака.**

## АНОНС!

Многіх нашых чытачоў цікавяць звесткі аб Францішку Багушэвічу, 150-годдзе з дня нараджэння якога мы толькі што адзначылі.

Так, вечар, прысвечаны памяці паэта, аб якім ідзе гаворка ў матэрыялах другой старонкі гэтага нумара газеты, адбыўся, але прыхільнікі Ф. Багушэвіча паранейшаму імкнуцца адкрыць новыя старонкі яго жыцця і творчасці.

**Пазіцыя кандыдата ў дэлегаты**

## *ЗА РАДЫКАЛЬНАЕ АБНАЎЛЕННЕ*

**У гэтым артыкуле — грамадзянская пазіцыя, погляды, разважанні Казіміра Канстанцінавіча КОЙТЫ, кандыдата філасофскіх навук, сакратара парткома Гродзенскага медінстытута, вылучанага партарганізацыяй гэтага інстытута кандыдатам у дэлегаты XXVIII з 'езда КПСС па Гродзенскай—Ленінскай выбарчай акрузе № 2.**



Словамі, якія вынесены ў загаловак, нікога не здзівіш. Цяпер усе за абнаўленне — пачынаючы з самых замшэлых кансерватараў, ахопленых настальгіяй па мінуламу, і канчаючы «рэвалюцыянерамі», якія песцяць надзею на разбурэнне і КПСС, і дзяржавы. Безумоўна, што кожны ўкладае ў паняцце абнаўленне свой сэнс. Адны хацелі б звесці ўсё да абнаўлення ідэалагічнай фразеалогіі, пакідаючы ўсё ў жыцці па-старому, другія ж не супраць, каб ад існуючых грамадскіх узаемаадносін не засталося каменя на камені, але да пары, з чыста тактычных меркаванняў, яны гатовы прыкрываць свае задумы рыторыкай перабудовы. Кансерватары плануюць дасягаць сваіх мэт, выкарыстоўваючы арсенал «апаратных гульняў», і ў сілу інерцыі камандна-адміністрацыйнага ўздзеяння, «рэвалюцыянеры» натхняюцца падзеямі, якія адбываюцца ў краінах, што называліся краінамі «народнай дэмакратыі», а на самай справе былі краінамі дыктатур Чаушэскаў, Хонэкераў і г. д. ды бездапаможнасцю цяперашняга нашага кіраўніцтва ў спрабаваннях вывесці краіну з крызісу. Большасць радавых партыйцаў і беспартыйных крытычна настроена адносна кансерватараў і «апаратчыкаў» і на гэтым незадавальненні будуюць свае разлікі «рэвалюцыянераў». У такіх далёка не простых абставінах ідзе падрыхтоўка да XXVIII з 'езда КПСС.

Мяне, прызнаюся, некалькі здзіўляе сама накіраванасць перадз 'ездаўскай дыскусіі, якая разгарнулася ў сродках масавай інфармацыі, на партыйных сходах і пленумах, у сістэме палітычнай вучобы. Што ў цэнтры ўвагі? Структура партыйных арганізацый! Сысканне членскіх узносаў і іх выкарыстанне ў пярвічных арганізацыях! Пакінуць ці канфіскаваць са Статута партыі прынцып дэмакратычнага цэнтралізму! Ці будзе і далей КПСС выконваць авангардную ролю ў грамадстве або ператворыцца ў партыю парламенцкага тыпу!

Адны з гэтых праблем мне здаюцца другараднымі, другія народжаны кансерватызмам мыслення, аблытанага рапейнікам дагматычных установак. Сапраўды, ці будзе і далей КПСС выконваць авангардную ролю ў грамадстве, ці ператворыцца ў партыю парламенцкага тыпу? Тое, што для некаторых перспектыва пераўтварэння КПСС у партыю парламенцкага тыпу непрыймальная — гэта можна зразумець. Значна цяжэй усвядоміць, як можна ўсур 'ёз абмяркоўваць такую праблему ва ўмовах, калі шосты артыкул Канстытуцыі адменены, а многапартыйнасць становіцца рэальнасцю, калі блок «Дэмакратычная Расія» заваёўвае большасць ў Маскве, Ленінградзе, Светлагорску і іншых гарадах Расіі, калі працэс здачы партыйных білетаў набірае паскарэнне, а масы ўсё ў большай ступені страчваюць веру ў партыю.

Наша партыя была заснавана як партыя працоўных, якая абараняла інтарэсы працоўнага народа. Адзінства партыі і народа на першым этапе яе існавання было не лозунгам, а рэальнасцю. Але па меры таго, як кіраўніцтва партыі спрабавала перарабіць усе грамадскія адносіны, ды і самога чалавека па матрыцах сваіх абстрактных схем, адарваных ад жыцця і ігнаруючых аб 'ектыўныя законы развіцця грамадства, нарастала адчужэнне паміж масамі і партыйным кіраўніцтвам, якое ў наш час вылілася ў варожасць да работнікаў партыйнага і дзяржаўнага апарата.

Страта даверу тых, дзеля каго яна існуе — надзвычай страшнае, што можа напаткаць палітычную арганізацыю. Адраджэнне партыі, яе аўтарытэта — вось галоўная праблема, якая стаіць перад партыяй, вось што павінна быць у цэнтры ўвагі перадз 'ездаўскай дыскусіі. Усе астатнія пытанні, якімі б важнымі яны ні былі, павінны вырашацца зыходна з гэтай неабходнасцю. Толькі распрацоўка і ператварэнне ў жыццё ў бліжэйшыя гады праграмы вырашэння эканамічных і сацыяльных задач, якія паўсталі перад краінай, зможа прыпыніць падзенне аўтарытэту партыі і нарэшце забяспечыць ёй ролю палітычнага авангарду.

Нам неабходна крытычна пераасэнсаваць сваю дзейнасць, і на словах, і на справе пачаць і правесці перабудову партыі. Важнай умовай гэтага з 'яўляецца ачышчэнне партыі ад тых работнікаў апарата, якія здольны дзейнічаць толькі ў рамках старых схем, я не ў сілах асмысліць сваю новую ролю. На іх месца павінны прыйсці маладыя, ініцыятыўныя кадры.

Але кіраўнікі старой закалкі не збіраюцца самі пакідаць наседжаныя месцы, без якіх не ўяўляюць свайго існавання. Вось і аб 'яўляюцца «ерэтыкамі» тыя, хто адважваецца самастойна думаць і дзейнічаць, не пытаючы дазволу ў «непагрэшных». Напышлівыя павучанні, грубыя выкрыкі, пагрозы — вось арсенал ідэалагічных сродкаў, якімі толькі і могуць карыстацца прыхільнікі старых установак. Патрабаванне выключыць з партыі людзей, якія не раздзяляюць палажэнняў праекта платформы ЦК КПСС, таму сведчанне. Паўстае пытанне: навошта называць яго праектам, калі ў ім усё свята?!

Я лічу, што ні праект платформы ЦК КПСС «Да гуманнага дэмакратычнага сацыялізму», ні «Дэмакратычная платформа», ні «Марксісцкая платформа ў КПСС» не з 'яўляюцца ісцінамі ў апошняй інстанцыі, на якія можна толькі маліцца. У кожнай з іх нямала каштоўнага, але ёсць і нямала спорнага.

Большасць камуністаў, якія прымаюць удзел у абмеркаванні гэтых дакументаў, адзначаюць шматслоўе, абстрактнасць, «лозунгавы стыль» у духу часоў застою платформы ЦК КПСС. Мы ніяк не можам пазбавіцца ад тыраніі выдуманых нашым кіраўніцтвам «формул-заклінанняў», паўтараючы якія, хочам дасягнуць жадаемага выніку. Такімі былі: «Цяперашняе пакаленне савецкіх людзей будзе жыць пры камунізму». «Эканоміка павінна быць эканомнай» і іншыя. Каэфіцыент іх карыснага дзеяння нам усім добра вядомы. Зараз прапануецца ўвесці «планава рэгуліруемую рыначную эканоміку». Няхай так. Любое абстрактнае палажэнне можна тэарэтычна абаснаваць або адвергнуць. Але што гэтае палажэнне азначае прымяняльна да рэальнага жыцця, не толькі масы беспартыйных, але і большасць членаў партыі ўяўляюць больш чым цьмяна. Сумняваюся, што тыя, хто адстойвае гэтае палажэнне, добра арыентуюцца што да чаго. А ўспомнім: асноўныя палажэнні першай праграмы партыі былі зразумелыя ўсім, нават тым, хто не ўмеў ні пісаць, ні чытаць. Калі будучы XXVIII з 'езд КПСС не выпрацуе дакладную, зразумелую ўсім і падтрымліваемую большасцю праграму дзеянняў на бліжэйшыя гады, ён не апраўдае надзей, якія ўскладзены на яго масамі радавых партыйцаў.

У аснову абнаўлення партыі павінны быць пакладзены прыярытэт агульначалавечых каштоўнасцей над класавымі. У партыі і яе апарата не павінна быць інтарэсаў і імкненняў, адрозных ад інтарэсаў і імкненняў працоўных. Статут павінен дакладна вызначаць, што выкарыстанне прывілей несумяшчальна з партыйнай дысцыплінай і знаходжаннем у радах партыі.

У перадз 'ездаўскай дыскусіі нямала спрэчак наконт прынцыпу «дэмакратычнага цэнтралізму». Калі падыходзіць да праблемы сур 'ёзна, неабходна прызнаць, што ўсе без выключэння палітычныя партыі ў свеце дзейнічаюць у адпаведнасці з гэтым прынцыпам, але не абстрактна абвяшчаемым, а канкрэтызаваным у размеркаванні правоў і абавязкаў усіх партыйных звенняў. У нас жа на працягу дзесяцігоддзяў «дэмакратычны цэнтралізм»выконваў ролю славеснай шырмы, прыкрываўшай таталітарысцкую будову ў партыі і дзяржаве. Адсюль і негатыўныя адносіны да тэрміна пэўнай часткі партыйцаў. Неабходна выпрацаваць такі статут, у якім функцыі кожнага партыйнага органа былі б дакладна вызначаны і выключалі ўсякі дыктат вышэйстаячых да ніжэйстаячых па-за рамкамі іх кампетэнцыі. На жаль, такога падыходу ў праекце новага Сатута я не знаходжу. Больш таго, як будуць дзяліць паміж сабой функцыі старшыня партыі і яго намеснік, з аднаго боку, і Прэзідыум ЦК КПСС з другога боку. Я не лічу, што чым больш кіруючых органаў, тым лепш. А так і ў дзяржаўным маштабе ў нас: з 'езд Светаў, Вярхоўны Савет, Прэзідэнцкі Савет, Савет федэрацыі! Што яшчэ ў бліжэйшы час! А ў краіне адначасова рост злачыннасці, дэфіцыт самых неабходных тавараў, мафіёзны распродаж народных багаццяў аж да ўзбраення, падзенне працоўнай дысцыпліны, міжнацыянальная варожасць. Барацьба з гэтымі негатыўнымі з 'явамі павінна стаць адной з галоўных задач у дзейнасці партыі. Партыйны апарат павінен адмовіцца ад функцыі кантролю праваахоўных органаў, якім павінна быць нададзена поўная свабода дзеянняў у межах закона.

Неабходна рашуча парваць з традыцыяй, па якой партыйныя камітэты ўсіх узроўняў каардынавалі работу, а на самой справе ажыццяўлялі палітычнае верхавенства над Саветамі, прафсаюзамі, арганізацыямі і ўстановамі. Застарэла палажэнне, адпаведна якога першы сакратар партыйнага камітэта стаяў у табелі аб рангах вышэй, чым старшыня выканкома. Камуністы, абраныя ў Саветы, павінны атрымаць магчымасць непасрэднага ўдзелу ў рабоце адпаведнага партыйнага камітэта. З часам, магчыма, менавіта ім будзе належыць вядучая роля ў кіраўніцтве партыйнымі арганізацыямі адпаведнай тэрыторыі.

Гісторыя паказала, што без палітычнага плюралізму не можа быць сапраўднага народаўладдзя. Партыя павінна даказаць сваё права на авангардную ролю ў барацьбе з іншымі палітычнымі сіламі. Без заваёвы на свой бок сімпатый мас гэтага дасягнуць немагчыма. А заваяваць на свой бок масы можна толькі жывучы іх інтарэсамі і абараняючы гэтыя інтарэсы. Іншых магчымасцей проста няма.

# 150 гадоў з дня нараджэння паэта



*Цікавыя звесткі з біяграфіі Багушэвіча, вытрымкі з яго цудоўных твораў зацікавілі слухачоў. Узнёслыя і пранікнёныя, простыя і сардэчныя словы літаратуразнаўцы Генадзя Кісялёва і мовазнаўцы Івана Крамко, супрацоўнікаў АН БССР (на здымку) аб нацыянальным беларускім паэце даходзілі да сэрца кожнага, хто прысутнічаў на вечары.*

## ЧАЛАВЕК ЧУЛАГА СЭРЦА

Дваццаць першага сакавіка споўнілася 150 год з дня нараджэння адной з самых яркіх і каларытных фігур у беларускай культуры і літаратуры XIX ст., паэта-дэмакрата Францішка Багушэвіча.

З біяграфіі Багушэвіча вядома, што ён вучыўся ў Пецярбургскім універсітэце, удзельнічаў у студэнцкіх хваляваннях, у паўстанні 1863 г. А пра адзін з момантаў біяграфіі Багушэвіча — працы яго ў якасці следчага — расказвае Васіль Хомчанка ў аповесці «Пры апазнанні — затрымаць». Гэты твор у беларускай літаратуры новы, таму што гэта першы твор, у якім разглядаецца біяграфія Багушэвіча. Твор цікава чытаецца, вядзе за сабой чытача, хаця ў ім ёсць недакладнасць, супярэчнасці з гісторыяй, ды і сам аўтар у асобных момантах супярэчыць сабе. Але твор заслугоўвае ўвагі.

Што гэта была за асоба — Францішак Багушэвіч? Як пачыналася яго творчасць? Як адносіўся ён да людзей, з якімі даводзілася сустракацца на службе і ў жыцці? Адказы дае аповесць.

Гэтага чалавека з пышнымі шляхецкімі вусамі, спакойнага і цвёрдага ў сваіх меркаваннях, вельмі любілі людзі, асабліва простыя сяляне. Чалавек чулага сэрца і дэмакратычных перакананняў, Багушэвіч з выключнай увагай ставіўся да разгляду кожнай справы, якая датычылася простага працоўнага чалавека. Нездарма Багушэвіча называлі мужыцкім адвакатам. Ён падыходзіў да падсуднага не як да злачынцы, а як да чалавека, ставіў сябе на яго месца. Ён чула адносіўся да злачынцаў, бо ведаў, што не толькі людзі павінны ў тым, што яны зрабілі, часцей вінавата жыццё, умовы, у якіх яны жывуць. Багушэвічу па характару службовай дзейнасці даводзілася непасрэдна сутыкацца з інтарэсамі і патрэбамі народа. У судовых спрэчках сялян з памешчыкамі адвакат Багушэвіч часта адкрыта ставіўся на бок сялян.

Глыбокая дума аб лёсе народа і роднай краіны неадступна хвалявала яго. Гарачую і бескарыслівую любоў да радзімы і народа, да простых людзей працы Багушэвіч пранёс праз усё сваё жыццё.

Багушэвіча ўвесь час турбуе праблема беларускай мовы, беларускай народнасці. Адносіны Багушэвіча да мовы В. Хомчанка выказаў словамі, узятымі з верша паэта:

Ой, нашто ж мне дана тая мова,  
Як я не ўмею сказаць тое слова,  
Каб яго пачулі, каб яго пазналі,  
Каб яго, то слова, ды праўдай назвалі,  
Каб і разышлося то слова па свеце,  
Як праменні сонца, цёплага ў леце;  
Каб на тое слова ды людцы зрадзелі  
Так, як тыя дзеткі на святой нядзелі;  
Каб жа тое слова ды людцоў з´яднала,  
Каб на тое слова ворагаў не стала;  
Каб людцы прызналі братоў ды братамі...

Не пашкодзіла б і нам задумацца над гэтымі словамі, напісанымі больш ста гадоў назад таленавітым паэтам Францішкам Багушэвічам.

**М. ПІСАРУК,**  
**студэнтка 5 курса**  
**філалагічнага факультэта.**



# «Усім будзе чутка...»

ФРАНЦІШАК Багушэвіч увайшоў у беларускую літаратуру як адзін з яе найбольш таленавітых пачынальнікаў, як аўтар двух паэтычных зборнікаў, як заснавальнік нацыянальнай прозы, таленавіты і прагрэсіўны публіцыст. Рэфарматар у галіне вершаскладання, шчыры дбайца пра пашырэнне выразных магчымасцей літаратурнай мовы, абаронца прэстыжу «мужыцкай» літаратуры — гэта таксама Багушэвіч, гэта яго штодзённы клопат, яго мастакоўскае крэда.

Паэзія Багушэвіча такая ж бескампрамісная, як і сам яе стваральнік. Індывідуальны свет пісьменніка — гэта свет, у якім рэчаіснасць змадэлявана па прынцыпу рэзкіх маральных кантрастаў: дабро і зло, праўда і крыўда, беднасць і багацце, адухоўленасць і бяздумнае марнаванне жыцця. Лірычны герой паэта заўсёды бедны, але ён не толькі пакутуе і скардзіцца, ён ганарыцца сваёй чалавечай нязломнасцю, выратоўваецца адчуваннем уласнай годнасці.

Паэт разбураў складзены і афіцыйна прапагандуемы міф пра «забітасць» беларускай вёскі, абуджаў у селяніне чалавека і беларуса. «Мова наша ёсць такая ж людская і панская, як і французская, альбо нямецкая, альбо і іншая якая,» — гэта не толькі пра мову гаворыцца, гэта пра самаадчуванне цэлай нацыі, гэта наперакор спрадвечнаму комплексу нацыянальнай непаўнацэннасці. «Наша мова для нас святая, бо яна нам ад бога даная, як і другім добрым людцам, і гаворым мы ёю шмат добрага, але так ужо мы самі пусцілі яе на здзек, не раўнуючы, як і паны вялікія ахвотней гавораць па-французску, як па-свойму».

Шукаючы вытокі сялянска-беларускай прыніжанасці, да вышынь высокай эстэтыкі ўзнімаючы непаўторнасць то пяшчотнай, то рэзкай «гаворкі», Багушэвіч сілай мастацкай прадбачлівасці пераадолеў бар´еры часу, прыйшоў са сваім клопатам непасрэдна да нас, каб на новым павароце нацыянальнай гісторыі з асаблівай сілай ажыло яго паэтычнае і публіцыстычнае слова.

Багушэвіч — паэт, для якога нібы не існавала другарадных дэталяў. Апісанне сялянскай хаты, элемент мужыцкай вопраткі, мазоль на спрацаваных руках — усё ператваралася ў паэтычны сімвал, станавілася штуршком для шырокіх абагульненняў. На жаль, і сёння яшчэ можна пачуць выказванні пра сціпласць і праставатасць сялянскай музы беларускага паэта. Але не трэба забываць на тое, што праставатасць ніколі не караецца такой высокай мераю, як поўная забарона друкавання, і ніхто не будзе судзіць прыземлены, сціплы талент праз восем гадоў пасля смерці самога аўтара. Суд, які распачала над «Дудкай беларускай» Пецярбургская судовая палата ў 1908 годзе, — гэта ўнікальны для гісторыі суд і адно з самых непасрэдных сведчанняў вышэйшага ідэйна-мастацкага гатунку, у якім выкананы верш нашага песняра.

Цікава, што першыя чытачы (а вельмі часта нават слухачы) Багушэвічавых вершаў вельмі добра зразумелі асноўны пафас паэтавых выступленняў. Не спакушаныя ў прыгожым пісьменстве, а часта і зусім не адукаваныя, яны тым не менш за дзесяць кіламетраў неслі ў 1900 годзе нябожчыка на ўласных руках і, што самае галоўнае, да нашага часу захавалі поўныя павагі і чараў легенды пра добрага адваката-заступніка і свайго паэта.

9 сакавіка 1990 года споўнілася 150 гадоў з дня нараджэння беларускага паэта, а 15 красавіка — 90 год па яго смерці. Жывучы паміж двума юбілеямі Багушэвіча, удзячная беларуская грамадскасць са шчырай павагай згадвае імя вялікага песняра.

**Н. ТАРЭЛКІНА,**  
**дацэнт кафедры беларускай**  
**літаратуры.**

* * *

*Чыталі на вечары шматлікія вершы Францішка Багушэвіча і гэтыя дзяўчаты-першакурсніцы, якіх вы бачыце на здымку. Вядома, хваляваліся, але ж былі і радасныя хвіліны, калі дружна апладзіравалі ім усе тыя, хто прысутнічаў у зале. Ды і не ў гэтым, нарэшце, галоўнае. У час падрыхтоўкі да вечара ўшанавання паэта яны яшчэ раз блізка дакрануліся сэрцам да такіх цёплых, пранікнёных радкоў...*

*...Цяпер зраблю дудку*  
*Ад жалю, ад смутку.*  
*Га! Зраблю ж другую,*  
*Жалейку смутную, —*  
*Ды каб так заграла,*  
*Каб зямля стагнала,*  
*От каб як заграла:*  
*Каб слязьмі прабрала,*  
*Каб аж было жудка,*  
*От-то мая дудка!...*

* * *



# ЖЫЦЬ ПАЭТУ Ў ВЯКАХ...

Ні на хвіліну не спыняецца імклівы цягнік жыцця. Адна падзея змяняецца другой, і часам можа здарыцца так, што менавіта нейкая нязначная на першы погляд падзея акрыліла цябе, узняла на вышэйшую ступень. А ўзняўшыся на такую ступень, чалавек пачынае заўважаць тое, чаго раней не бачыў і не разумеў.

Вялікую ролю ў нашым жыцці адыгрывае мастацтва. Нібы ясны прамень, асвятляе нам дарогу ў жыццё. Мастацтва нішто не зможа замяніць, сцерці. Яно вечна будзе жыць у сэрцах тых, хто яго тварыў і творыць сёння.

Выдатны беларускі паэт Францішак Багушэвіч усё сваё жыццё прысвяціў мастацтву. Ён быў вельмі значнай і яркай фігурай у гісторыі беларускай літаратуры XIX стагоддзя. Таленавіты паэт, публіцыст, празаік, ён увайшоў у беларускую літаратуру як заснавальнік крытычнага рэалізму, першы буйны нацыянальны, народны пісьменнік, перакананы і паслядоўны дэмакрат, абаронца прыгнечаных і абяздоленых.

І вось ужо 150 год мінула з дня нараджэння Ф. Багушэвіча.

У сценах нашага універсітэта прайшоў вечар, прысвечаны гэтай даце. Гарачыя словы публіцыста гучалі са сцэны, і хоць гаварыў іх не сам Багушэвіч, а нашы студэнты, не пакінулі яны абыякавымі прыхільнікаў паэзіі. Прысутнічалі тут і госці са сталіцы — літаратуразнаўца Генадзь Кісялёў і мовазнаўца Іван Крамко. Яны таксама прынялі ўдзел у нашым вечары. На першы погляд — звычайныя людзі. Але як перакананa, праўдзіва гавораць яны пра тое, што здаецца вядомым, рэальным, паколькі добра ведаюць жыццё, справу, якой прысвяцілі сябе.

Змітрок Бядуля гаварыў: «Праз слёзы і смех, праз гнеў і абурэнне, праз нянавісць да разнастайных эксплуататараў беднага сялянства і праз любоў да пакрыўджанага вякамі беларускага народа мы бачым і адчуваем у творах Багушэвіча гарачае, чэснае, адзыўлівае сэрца паэта-мастака, паэта-свабодалюбца».

Незалежна ад таго, у якім стагоддзі жыве чалавек, але калі ён разумее мастацтва, то разумее і жыццё. І менавіта з твораў Ф. Багушэвіча мы пачынаем заўважаць прыгажосць наваколля, адчуваць адказнасць за даручаную справу, адчуваць сябе свядомым грамадзянінам рэспублікі.

І доўга яшчэ палымянаму слову паэта жыць у вяках.

**А. ПЯШКО,**  
**студэнтка I курса**  
**філалагічнага факультэта.**

*ДАЛЁКАЕ — БЛІЗКАЕ*

# ДЗЕКАБРЫСТКІ — ВЯЗНІ БРЫГІЦКАГА КЛЯШТАРА

**Гэты артыкул быў напісаны амаль што месяц таму. Я скончыў яго словамі жалю аб адсутнасці мемарыяльнай дошкі ў гонар сясцёр-дзекабрыстак Рукевіч. Але ў нашых сілах выправіць гэту несправядлівасць. Гарадскі Савет таварыства аховы помнікаў звяртаецца да вас, студэнты, выкладчыкі і супрацоўнікі універсітэта: здадзім добраахвотны ўзнос на ўстаноўку мемарыяльнай дошкі! Адгукніцеся: камітэт камсамола, прафкомы і партком — дапамажыце добрай справе ўвекавечання памяці землякоў!**

**Добраахвотны ўзнос у любой суме прымуць: у галоўным корпусе — камітэт камсамола, з 9 да 17 гадзін; у корпусе № 2 па вул. Даватара — на гістарычным факультэце, ст. лабарант кафедры гісторыі СССР М. Саваняка.**



22 мая 1827 г. цяжкая брама жаночага кляштара св. Брыгіты адчынілася, і на двор увайшлі дзве дзяўчыны ў суправаджэнні гродзенскага паліцмайстара. Праз некаторы час ён асцярожна злажыў распіску ігуменні Барбары Хрэптовіч, дзе роўным почыркам на польскай мове было напісана, што яна прыняла «две панны Ксаверу и Корнелию Руковичовны для удержания в монастыре Бригиток Гродненских первой сроком год, а другой — шесть месяцев, и что иметь над ними строгий надзор...» Паліцмайстар са стараннасцю выканаў даручэнне, і гродзенскі губернатар Міхаіл Трафімавіч Бабяцінскі 26 мая мог паведаміць Мікалаю і аб заняволенні сясцёр Рукевіч у Брыгіцкі кляштар.

**Такім чынам, прысуд цара быў выкананы, але чаму Рукевіч заслужылі яго!**

У верасні 1926 г. завяршыліся пасяджэнні ваенна-судзебнай камісіі па справе аб тайнай дзекабрысцкай арганізацыі «Ваенныя сябры». Гэта таварыства ўзнікла летам 1825 г. па ініцыятыве былога філамата Міхаіла Іванавіча Рукевіча і ставіла мэтай «просвещение себя, взаимную помощь и благо общее». Аднак асветніцкія задачы ўтойвалі больш тайнае — «Вольнасць», г. зн. барацьба з прыгонніцтвам і самадзяржаўем. Інакш навошта была строгая канспірацыя: падзяленне арганізацыі на тры ступені па пяць чалавек у кожнай і зносіны паміж імі толькі праз кіраўнікоў ступеняў? Заснавальнікамі Таварыства «ваенных сяброў» быў разам з Рукевічам капітан Літоўскага піянернага батальёну Канстанцін Густавіч Ігельстром і яго стрыечны брат паручык гэтага ж батальёну Аляксандр Іванавіч Вягелін. Прэзідэнтам жа стаў падпаручык Нясвіжскага карабінернага палку Пётр Іванавіч Гофман.

9 месяцаў працавала ў Беластоцкім палацы Браніцкіх следчая камісія. Больш як 140 чалавек дапытала яна. Рукевіч, Вягелін, Ігельстром былі прысуджаны да 10 гадоў катаржных работ у Сібіры і далейшага там пасялення. Шасцімесячны тэрмін у арэстанцкіх ротах Бабруйскай крэпасці адбылі Гофман, Э. А. Пятроўскі, П. П. Ваяховіч, М. Ф. Вільканец, пяцігадовы тэрмін — А. М. Угрычыч-Трэбінскі, чатырохмесячны — Ф. Баркоўскі і А. Д. Яневіч. На пяць гадоў катаргі і пасяленне ў Сібіры саслалі А. М. Грыневіцкага, А. І. Вронскага, І. С. Высоцкага, братоў К. В. і Ф. В. Ардынскіх. Як бачым, толькі пятнаццаць «ваенных сяброў» былі прысуджаны да больш ці менш суровых пакаранняў, а большасць — да высылкі на месца жыхарства пад нагляд паліцыі. І ў гэтым таксама заслуга Ксаверыі і Карнеліі Рукевіч — родных сясцёр Аляксандра Іванавіча Рукевіча.

Імёнаў сясцёр Рукевіч не было ў спісах членаў Таварыства ваенных сяброў, але Ксаверыю і Карнелію можна назваць дзекабрысткамі ў поўным сэнсе гэтага слова. Яны заслужылі гэта не менш, чым спадарожніцы дзекабрыстаў у Сібіры. У ваенна-судзебнай справе паручыка Самагіцкага грэнадзёрскага палку І. Н. Пац-Памарнацкага ёсць упамінанне аб тым, што ў верасні-кастрычніку 1825 г. ён быў у маёнтку Рукевіч — Завыках, бачыў Ігельстрома, Вегеліна, Стракоўскага і трох сясцёр. Відаць, быў нейкі сход таварыства і, як бачым, ад Карнеліі і Ксаверыі нічога не ўтайвалі. Карнелія на следстве паказала, што Ігельстром нічога ад яе не ўтайваў. Больш таго — яна заявіла, што чула ад брата аб двух палітычных партыях у Пецярбургу і была сведкай размовы з імі паміж Рукевічам і Ігельстромам. Унясем маленькае ўдакладненне — аб падзеях у Пецярбургу Карнелія ведала не ад брата, а ад жаніха, які прызнаўся на следстве ў атрыманні ліста ад В. К. Кюхельбекера, які перабег праз тэрыторыю Беларусі ў Варшаву. Але ўдакладненне не змяняе сутнасці справы — сёстры ведалі аб дзейнасці Таварыства ваенных сяброў.

Рукевіч аказалі неацанімую паслугу тайнай арганізацыі. Калі Ігельстрома арыштавалі, яго слуга Павел Паршнёў прывёз у Завыкі і аддаў Ксаверыі зялёны куфэрак з паперамі. Следчай камісіі Ксаверыя расказвала, што зрабіла пасля свайго першага допыту ў генерала-маёра Пэрэна, прэзуса ваеннага суда: «Воротясь из Белостока в Завыки в воскресный день, я нашла сестру свою (вероятно, Антонину — В. Ш.) отъезжающей в костёл и послала с ней почти всех людей. Сама осталась дома, дождалась, когда еженедельный сторож затопил печь в моей комнате. Сперва положила в печь бумаги, потом оторвала клещами от шкатулки петли, сунула в печь сначала крышку, а после шкатулку с бывшими у оной замком и железом. Петли бросила в кладовую к прочим железным вещам, а ключик — в реку. Когда сестра вернулась из костела и вошла ко мне, то печь еще топилась, но никаких признаков сожжения шкатулки уже не было».

Ксаверыя растлумачыла свой учынак жахам перад карай за спаленне масонскіх знакаў і патэнту. Як вядома, у 1822 годзе ўказам Аляксандра I масонскія ложы былі забаронены і, вядома, каб захаваць сляды іх знішчэння, яна спаліла ўсе астатнія дакументы і куфэрак. Сенатар Навасільцаў у рапарце цэсарэвічу Канстанціну Паўлавічу паводзіны Ксаверыі тлумачыў іншымі матывамі: «она сие сделала по робости и слабости ее к брату, внушаемой нравственностию и законами, так сие обстоятельство, что она не знала о важности сих бумаг...» Так, Ксаверыя любіла брата і свайго жаніха Вягеліна, але не «робость и слабость» прымусілі спаліць паперы з куфэрка, а менавіта разуменне «важности сих бумаг» і ўсведамленне іх антыўрадавай сутнасці. Гледзячы ў агонь печы, Ксаверыя ведала, што сваім учынкам яна ратуе брата, каханага, іншых «ваенных сяброў».

Зялёны куфэрак быў чатыры з паловай вяршкі вышынёй, каля сямі шырынёй і дзесяць даўжынёй (вяршок — 4,4 см). Зусім звычайны куфэрак, але вось дакументы, якія захоўваліся ў ім, незвычайныя. Мы можам толькі меркаваць, што знаходзілася ў куфэрку, які належыў аднаму з арганізатараў тайнага таварыства і выступлення Літоўскага піянернага батальёну. Ці не тут ляжалі: спіс членаў арганізацыі, іх распіскі, Праграма ці Статут, «Маральныя меркаванні» і г. д. Тое, што гэтыя дакументы не трапілі ў рукі следства, дапамагло «ваенным сябрам»назвацца толькі членамі асветніцкай арганізацыі, а не такой, як Паўночнае ці Паўднёвае таварыства дзекабрыстаў. І прысуды беластоцкага ваеннага суда больш мяккія ў параўнанні з Пецярбургскім следчым камітэтам.

Ксаверыя трымалася на следстве з годнасцю: «запиралась в принятии оных (т. е. вещей и бумаг Игельстрома В. Ш.) как равно и обо всем ей известном не учинила признания». Яе паводзіны Ігельстром ставіў у прыклад А. М. Угрычыну-Трэбінскаму, які парушыў угавор маўчаць і пачаў расказваць пра дзейнасць тайнага таварыства: «Я не говорю о себе, моя участь решена... Но вспомни, сколько особ остается, которые могут быть спасены, а ты хочешь погубить их. Неужели,женщина, девушка должна превзойти тебя в твердости духа?»

Карнелія на следстве давала ілжывыя паказанні. Яна заявіла, што прысутнічала пры спаленні папер і куфэрка, хаця з лістападу 1825 па люты 1826 г. знаходзілася ў Абрэмшчызне Гродзенскай губерніі ў свайго дзядзькі Баржэнскага. Цераз «зорянина» Ф. Ардынскага Карнелія спрабавала ўстанавіць сувязі з братам, быццам для таго, каб раіцца «насчет хозяйства». І ўспомнім яшчэ аб яе паказаннях аб «двух партиях в Петербурге».

Як бачым, сёстры Рукевіч сапраўды заслужылі свой прысуд і, як дзекабрысткі, панеслі кару. Ваенны суд не вызначыў яе, прадстаўляючы на «рассмотрение вышнего начальства». Былы камандзір Літоўскага асобнага корпуса генерал ад інфантэрыі Ф. Ф. Доврэ лічыў, што Ксаверыя Рукевіч, якая знаходзілася з 29 красавіка 1826 г. пад арыштам у Беластоцкім дзявочым кляштары, ужо гэтым пакарана дастаткова, а Карнелію Рукевіч «выдержать под арестом в монастыре один месяц». Цэсарэвіча Канстанціна Паўлавіча, галоўнакамандуючага Літоўскім асобным корпусам, гэта не задавальняла. Ён лічыў, што ўчынкі сясцёр «суть по законам разрушающие дворянское достоинство,...сослать в Сибирь на поселение». Аднак царская канфірмацыя была мякчэйшай: «сестер шляхтича Рукевича Ксаверию и Корнелию вместо определяемого им его высочеством наказания содержать в монастыре — Ксаверию — один год, а Корнелию — шесть месяцев». Заставалася пастанавіць, у які кляштар змясціць дзекабрыстак. Пачалася перапіска паміж кіраўніком Беластоцкай вобласці графам Валовічам і гродзенскім грамадзянскім губернатарам і стацкім саветнікам М. Т. Бабяцінскім. Валовіч пытаўся 19 мая 1827 г.: «Не предстоит ли каких препятствий к заключению, в котором либо из означенных монастырей Корнелии и Ксаверии Руковичовен? И могу ли я по получении от Вас, милостивый государь, уведомления, отправить их для сего тот час в Гродно?: Губернатар адказаў гэтай жа эстафетай 20 мая: у Гродна ёсць тры дзявочых кляштара, але лепш «девиц Руковичовен», у Брыгіцкі, «как обширнейший от прочих двух» (г. зн. у параўнанні з кляштарамі Бернардынак і Базыліянак).

Кляштар св. Брыгіты будаваўся ў 1634-1642 гг. Яго заснавальнікамі былі: Кшыштоф Весялоўскі — маршал надворны літоўскі, староста цікацінскі, суражскі, крычаўскі, эканом гродзенскі і яго жонка Аляксандра Мар ́яна Весялоўская, уроджаная Сабеская. Заснаванне кляштара звязана з фактам смерці іх прыемнай дачкі Грызельды, жонкі маршала вялікага літоўскага Яна Станіслава Сапегі. Партрэты заснавальнікаў і Грызельды можна паглядзець у альбомах «Жывапіс Беларусі XII-XVIII стагоддзяў» і «Дзяржаўны мастацкі музей БССР». Мастак-рэстаўратар А. Б. Брындараў вярнуў іх да жыцця са становішча «клінічнай смерці», у якім яны былі ў момант іх выяўлення ў 1966 г. у склепе кляштара Брыгітак.

Пройдземся ў Гродна па вуліцах К. Маркса (былой Брыгіцкай) і Маладзёжнай (Навікаўсніцы). Высокія пяціметровыя каменныя сцены аддзяляюць нас ад брыгіцкага комплексу. У чатырох вуглах сцен, якія акружаюць манастырскі двор, размясціліся шасцізначныя маленькія вежы. У генеральным плане ўвесь комплекс мае ўсе элементы тыповага каталічнага кляштара: квадратны ўнутраны дворык, утвораны будынкамі касцёла і кляштара, фруктовы сад з агародам, двор з гаспадарчымі пабудовамі і самастойным уездам, парадны дворык перад уваходам у касцёл. Будынкі касцёла і кляштара складаюць адзінае цэлае і пабудаваны з цэглы. Архітэктура простая і лаканічная, у стылі барока. Касцёл — аднаднефавы храм з паўкруглай алтарнай часткай: двухвежны галоўны фасад, насычаны пластыкай (пілястрамі, плоскімі нішамі) і завяршаецца моцным антаблементам з ацікам, двух ́ярусным франтонам адной вышыні з вежамі. Архітэктура кляштарскіх карпусоў аскетычная. Фасады ажыўлены толькі нескладаным карнізам, праёмамі вокнаў і дзвярэй з простымі налічнікамі. Званіца з ́явілася пазней і з ́явілася прадуктам класіцызму канца XVIII — пачатку XIX ст. Знаходзілася па вул. К. Маркса і была знішчана ў 1960-1970-ыя гады. За сцяну брыгіцкага комплекса пранікнуць праз тры брамы, акружаныя парталамі.

Праз цэнтральную браму, якая знаходзілася на сучаснай вуліцы К. Маркса, зойдзем з нашымі вязнямі-дзекабрыстамі ў храм. Убачым галоўны алтар і іканастас з вітымі калонамі і вялікай іконай Маці божай, два бакавых алтара св. Брыгіты і св. Ганны, на балконе правай бакавой сцяны — арган, статую Давіда, які грае на арфе (скульптар — М. Фрыцэ), каля паўночнай сцяны — спецыяльную нішу для музычных хораў. І тут жа — дзверы на хоры і ў кляштар. Адчынім дзверы і зойдзем у калідор першага паверха кляштара. Тут знаходзіліся: памяшканне для гасцей, вялікая зала, аптэчка, капліца, спавядальная, трапезная. Па лесвіцы падымаемся на другі паверх, дзе былі пакоі манашак (каля 40), бібліятэка, два склады, кладоўка, пральня, архіў.

Вось тут і пражылі свой тэрмін сёстры Рукевіч: Карнелія з 22 мая па пачатак снежня (не раней 6) 1827 г., Ксаверыя з 22 мая 1827 г. па 3 чэрвеня 1828 г. Першы час Карнелія жыла ў маёнтку бацькі свайго жаніха Ігельстрома, а з вызваленнем сястры пасялілася разам з ей у сваяка — гродзенскага ўезнага маршала (правадыра дваранства) К. Баржэнцкага. Сёстры падтрымлівалі брата, сасланага ў Сібір, перапісваліся з жонкамі дзекабрыстаў. Ксаверыя пісала лісты жаніху Вягеліну і яго сястры — М. М. Козенс. Карнелія, відаць, збіралася да Ігельстрома ў Сібір. Вось што пісала М. Н. Валконская 14 мая 1828 г. генералу Ігельстрому: «Как ни страшно его положение здесь, тем не менее он страдает только от сознания, что причиняет столько горя Вам и заставляет делить свое несчастие ту, которая для него решается пожертвовать собою так великодушно!.. Предполагая, что м-ль Рукевич еще находится у Вас, я позволяю себе писать ей на следующей странице в надежде, что таким образом письмо дойдет до нее вернее».

Цікава, што напісала Валконская Карнеліі? Ці не падрабязныя парады, як выехаць у Сібір? Бо для дзекабрысткі «пожертвовать собою так великодушно!», несумненна, значыла паездку ў Сібір. Ключ да адказу можна знайсці ў лісце Валконскай да старэйшай сястры Рукевіча — Антаніны Крамской. Недзе ў чэрвені-ліпені 1826 г. яна пісала: «Покорившись своей участи, господа Вегелин и Игельстром не теряют надежды соединиться когда-либо с теми, кто им дороже жизни. Ваши сестры не могли бы достигнуть позволения у его величества приехать сюда к своим женихам?..» Ліст быў затрыманы 3-м аддзяленнем і яго не атрымаў адрасат. Сёстры Рукевіч, як вядома, не трапілі ў Сібір, а з канца 1820-х гадоў іх сляды зніклі, і аб іх далейшым жыцці нічога невядома.

...У каторы раз праходжу каля кляштара Брыгітак. Касцёл стаіць у лясах — працягваецца бясконцая рэканструкцыя. Усё гэтак жа дзейнічае псіхіатрычны дыспансэр і наркалагічны. І ўсё застаюцца ў маіх марах размешчаныя ў касцёле зала арганнай музыкі, карцінная галерэя ў кляштары, а на яго сцяне, ля галоўных варот — мемарыяльная дошка, прысвечаная дзекабрысткам — Ксаверыі і Карнеліі Рукевіч.

**В. ШВЕД,**
**дацэнт кафедры гісторыі СССР.**
**Фота У. САРОКІНА.**

Наш адрас:
230023, г. Гродна,
вул. Ажэшка, 22, пакой 404,
тэл. 44-80-70

Газета выходзіць штотыднёва

Гродзенская абласная ўзбуйненая друкарня
вул. Паліграфістаў, 4.

Тыраж 2000 экз.
Зак. 4447
АИ-01262

Рэдактар
Л. С. ЗАСЕЛЬСКАЯ.